**ТЭЛЕГРАМА**

Прэзідыум ЦК прафсаюза сардэчна віншуе калектыў універсітэта з прысуджэннем другога месца і грашовай прэміі па выніках Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва калектываў вышэйшых навучальных устаноў за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, якасці работы, паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана 1977 года. Жадаем калектыву новых творчых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у развіцці навукі.

Т. П. ЯНУШКОЎСКАЯ,
старшыня ЦК прафсаюза.

г. Масква.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (1196) ● 16 сакавіка 1978 г. Цана 2 кап.

## Адкажам новымі поспехамі

10 сакавіка ў актавай зале універсітэта адбыўся партыйна-прафсаюзны актыў БДУ. Ен быў прысвечан знамянальнай падзеі — па выніках усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае выкананне заданняў другога года дзесятай пяцігодкі сярод універсітэтаў і гуманітарных ВНУ Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР наш універсітэт заняў другое месца. БДУ ўзнагароджан Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, а таксама грашовай прэміяй. Узнагароду ўручыў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў.

На актыве выступіў рэктар БДУ У. М. Сікорскі. Ён, у прыватнасці, адзначыў: «У гэтыя дні падводзяцца вынікі работы другога года дзесятай пяцігодкі. Усе намаганні шматтысячнага калектыву нашага універсітэта ў юбілейным 1977 годзе былі накіраваны на дасягненне найвышэйшых паказчыкаў у працы. Усе структурныя падраздзяленні універсітэта пераглядзелі і ўзялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы; многія члены калектыву прынялі індывідуальныя сацыялістычныя абавязацельствы. На агульнауніверсітэцкім актыве былі прыняты павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы універсітэта ў цэлым, заключан дагавор аб сацспаборніцтве з Вільнюскім дзяржаўным універсітэтам.

Абавязацельствы, прынятыя калектывам БДУ на 1977 год, выкананы па ўсіх паказчыках вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай работы. Дадаткова праведзена вялікая работа па прапагандзе і вывучэнню новай Канстытуцыі СССР, матэрыялаў юбілейных пасяджэнняў. Важнае месца ў сацыялістычным спаборніцтве займалі пытанні далейшай інтэнсіфікацыі, павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу на аснове яго навуковай арганізацыі, дасканалення вучэбна-метадычнай работы. Толькі на агульнауніверсітэцкай навукова-метадычнай канферэнцыі на тэму «XXV з'езд КПСС і задачы павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй» было заслухана звыш 280 навукова-метадычных дакладаў.

У 1977 годзе працягвалася работа па ўкараненню тэхнічных сродкаў навучання, пры гэтым галоўная ўвага аддавалася комплекснаму выкарыстанню ТСН.

Далейшае ўдасканаленне атрымала вытворчая практыка студэнтаў, для правядзення якой за універсітэтам замацавана 350 баз.

Паспяхова выкананы планы і сацыялістычныя абавязацельствы і ў галіне навуковых даследаванняў. У 1977 годзе планавалася завяршыць навукова-даследчую работу па 122 тэмах. Фактычна завершаны работы па 125 тэмах.

Вялікае распаўсюджанне атрымала навукова-даследчая работа студэнтаў. Студэнты універсітэта ўдзельнічаюць у выкананні практычна ўсіх работ па дзяржбюджэтных і гасдагаворных тэмах.

Добрых паказчыкаў дасягнуў універсітэт і ў іншых галінах сваёй дзейнасці.

Але неабходна адзначыць, што мы выкарысталі яшчэ не ўсе нашы рэзервы. Вялікую работу прадстаіць прарабіць па павышэнню паспяховасці студэнтаў, узмацненню кантролю за навукова-метадычнай работай выкладчыкаў. Нам неабходна больш інтэнсіўна ўкараняць тэхнічныя сродкі навучання ў вучэбны працэс.

У галіне навукова-даследчай работы неабходна сканцэнтроўваць увагу на тэматыцы, якая мае вялікае народнагаспадарчае значэнне. Мы яшчэ недастаткова распрацоўваем методыку выкладання дысцыплін ва універсітэце.

Нам прадстаіць шмат папрацаваць і над рэалізацыяй комплекснага плана ідэйна-выхаваўчай работы. Больш увагі ўдзяляць камуністычнаму і маральнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць далейшаму развіццю ва універсітэце мастацкай самадзейнасці і спорту, таму што гэтыя паказчыкі будуць улічвацца пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Вялікую ўвагу неабходна аддаваць галоснасці сацыялістычнага спаборніцтва, прапагандзе лепшых дасягненняў, здзяйсняць бягучы кантроль за яго ходам».

Пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва ва універсітэце па выніках 1977 года прызнаны фізічны факультэт, на другім месцы факультэт радыёфізікі і электронікі, на трэцім — гістфак. Фізфаку ўручан пераходны чырвоны сцяг і ганаровая грамата рэктарата, парткома і мясцкома БДУ, факультэтам, якія занялі другое і трэцяе месцы—вымпелы і ганаровыя граматы.

Сярод кафедр універсітэта першае месца заняла кафедра гісторыі філасофіі і логікі, другое — кафедра этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, трэцяе — кафедра педагогікі. Гэтыя кафедры ўзнагароджаны вымпеламі і ганаровымі граматамі.

84 чалавекі з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў БДУ ўзнагароджаны знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1977 года». Вялікая група работнікаў універсітэта ўзнагароджана ганаровымі граматамі рэктарата, парткома і мясцкома БДУ. Многім аб'яўлена падзяка.

**ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ АДКРЫЦЦЯ І З'ЕЗДА РСДРП**



Дом-музей І з'езда РСДРП у Мінску. Пакой, у якім праходзілі пасяджэнні з'езда.

Фота А. ПРАНІШНІКАВА.

## Працаваць яшчэ лепш

### (ВЫНІКІ ЗІМОВАЙ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ)

У першым семестры 1977-78 навучальнага года калектыў універсітэта ў цэлым працаваў добра. Прыкметна павысіўся навукоза-практычны ўзровень падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, актывізавалася работа па ўкараненню тэхнічных сродкаў і новых прагрэсіўных метадаў навучання. Многае зроблена па ўдасканаленню форм і метадаў камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі. Больш мэтанакіравана сталі працаваць метадычныя камісіі. Палепшылася работа куратараў. Праароблена многа па выданню падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак. Узмацніўся кантроль за самастойнай работай студэнтаў і іх паспяховасцю ў міжсесійны перыяд. Скарацілася колькасць амаральных учынкаў, палепшылася вучэбная дысцыпліна студэнтаў.

Амаль усімі кафедрамі універсітэта распрацаваны рабочыя праграмы. Пры іх распрацоўцы асноўная ўвага ўдзялялася ліквідаванню дубліравання матэрыялу ў сумежных або звязаных паміж сабой курсах, выпрацоўцы адзінай методыкі пры выкладанні вучэбнага матэрыялу, выкарыстанні ТСН на лекцыях, семінарскіх і лабараторных занятках.

На кожным факультэце распрацаваны планы-графікі навучальнага працэсу па кожнай спецыяльнасці для студэнтаў І—ІІ курсаў. Падобныя графікі, як паказвае вопыт, маюць вялікае значэнне, асабліва для студэнтаў малодшых курсаў.

Вялікая работа ва універсітэце праароблена па вывучэнню новай Канстытуцыі, матэрыялаў нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, урачыстага пасяджэння ў Маскве, прысвечанага 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Паспяхова рашаецца задача па давядзенню да кожнага студэнта ўсёй паўнаты тэарэтычнага багацця, рэвалюцыйнага і наватарскага духу гэтых выдатных дакументаў нашай эпохі. Галоўным жа паказчыкам нашай работы з'яўляюцца вынікі экзаменацыйнай сесіі.

У цэлым па універсітэту паспяховасць студэнтаў у параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года ўзрасла нязначна (на 0,6 працэнта) і склала 93,72 працэнта. Найбольш высокіх вынікаў дасягнулі гуманітарныя факультэты: юрыдычны (98,5 працэнта), гістарычны (98,3 працэнта), журналістыкі (98,05 працэнта), а сярод прыродазнаўчых —біялагічны (95,3 працэнта) і механіка-матэматычны (94,1 працэнта) факультэты.

Знізілася паспяховасць у параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года на факультэтах: прыкладной матэматыкі (з 90,67 працэнта да 89,36 працэнта), радыёфізікі і электронікі (з 93,09 працэнта да 92,38 працэнта). Прыкладна такая ж паспяховасць у студэнтаў фізічнага факультэта (90,8 працэнта), хімічнага (93,7 працэнта), геаграфічнага (93,2 працэнта) і філалагічнага (93,5 працэнта).

Гаворачы аб паспяховасці, нельга не адзначыць якасны бок гэтага пытання. На выдатна здалі экзамены 1.456 студэнтаў (15,34 працэнта), у мінулым годзе 14,69. У параўнанні з мінулым годам колькасць студэнтаў, паспяваючых на выдатна і добра, павысілася на 1,4 працэнта і складае 61,4 працэнта. Засталася на тым жа ўзроўні колькасць студэнтаў, якія атрымалі змешаныя адзнакі (29,8 працэнта), у зімовую сесію мінулага года 29,6 працэнта; некалькі знізілася колькасць студэнтаў, якія атрымалі толькі здавальняючыя адзнакі (2,8 працэнта), у мінулым годзе 3,9 працэнта.

Аднак трэба адзначыць, што працэнт выдатна і добра паспяваючых студэнтаў на ФПМ склаў усяго 49—ніжэй агульнауніверсітэцкага паказчыка на 12,4 працэнта, а на механіка-матэматычным, хімічным і геаграфічным факультэтах — 52 працэнты, г. зн. ніжэй на 9,4 працэнта. Вялікая колькасць студэнтаў, якія маюць толькі здавальняючыя адзнакі, на факультэтах: радыёфізікі і электронікі (7,2 працэнта), хімічным (5,9 працэнта), ФПМ (5,7 працэнта). На гэтых жа факультэтах і вялікая колькасць студэнтаў, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі: ФПМ — 10,6 працэнта, радыёфізікі і электронікі — 6,7 працэнта, хімічным — 6,2 працэнта. Шмат нездавальняючых адзнак і на фізічным — 8,8 працэнта, геаграфічным — 6,7 працэнта.

Некалькі знізілася агульная паспяховасць студэнтаў па грамадскіх дысцыплінах у параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года (у гэтым годзе — 97,7 працэнта, у мінулым — 98,2 працэнта). Гэта зніжэнне ў асноўным адбылося за кошт зніжэння паспяховасці па гісторыі КПСС (паспяховасць склала 97,4 працэнта), а па астатніх грамадскіх дысцыплінах яна павысілася: па марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму атэізму, этыцы і эстэтыцы складае 100 працэнтаў, навуковаму камунізму — 99 працэнтаў, палітычнай эканоміі — 98,4 працэнта.

Вынікі здачы экзаменацыйнай сесіі студэнтамі вячэрняга аддзялення характарызуюцца наступнымі паказчыкамі: з 2.985 студэнтаў-вячэрнікаў, абавязаных здаваць экзамены, здалі іх па ўсіх прадметах 2.541 чалавек (каля 80 працэнтаў).

Са здаўшых экзамены атрымалі адзнакі: выдатна — 179, або 6 працэнтаў, выдатна, добра і толькі добра — 709, або 23,7 працэнта, змешаныя адзнакі — 1.077, або 36,1 працэнта і толькі здавальняюча—576, або 19,3 працэнта.

Аналізуючы якасную характарыстыку адзнак студэнтаў-вячэрнікаў, можна сказаць, што 29,7 працэнта студэнтаў вучацца на выдатна і добра, 36,1 — маюць змешаныя адзнакі, 19,3 — вучацца толькі на здавальняюча.

У цэлым паспяховасць на вячэрніх аддзяленнях універсітэта за першы семестр 1977-78 навучальнага года складае 85,1 працэнта. У параўнанні з мінулым навучальным годам паспяховасць павысілася на 2,2 працэнта.

Вышэй сярэдняй паспяховасці па універсітэту паспяховасць на факультэтах: хімічным (88,8 працэнта), юрыдычным (88,6 працэнта), біялагічным (85,7 працэнта), гістарычным (87,7 працэнта).

Ніжэй сярэдняй па універсітэту маюць паспяховасць факультэты: механіка-матэматычны (84,8 працэнта), філалагічны (84,8 працэнта), радыёфізікі і электронікі (84,2 працэнта), фізічны (81,2 працэнта), геаграфічны (81 працэнт), журналістыкі (80,8 працэнта).

Пэўных поспехаў дабіўся універсітэт у арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў. У 1977 годзе ў гэтай рабоце прымала ўдзел 76 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Працаваць яшчэ лепш

## (ВЫНІКІ ЗІМОВАЙ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ)

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

У час падрыхтоўкі і правядзення сесіі выяўлены выпадкі, калі асобныя выкладчыкі не з'яўляліся або спазняліся на кансультацыі. На некаторых кафедрах не было наладжана дзяжурства выкладчыкаў. На жаль, не ўсе загадчыкі кафедр пабывалі на экзаменах у сваіх выкладчыкаў, не пацікавіліся, як студэнты засвоілі праграмны матэрыял, якія недахопы былі ў методыцы правядзення экзаменаў і г. д.

На бягучай і выніковай паспяховасці адмоўна адбіваецца і слабая вучэбная дысцыпліна асобных студэнтаў. На працягу першага семестра бягучага навучальнага года па няўважлівых прычынах па дзённай форме навучання прапушчана 23.565 гадзін. Найбольшая колькасць прапушчаных заняткаў на фізічным, механіка-матэматычным, філалагічным факультэтах, а сярод курсаў найбольшая колькасць пропускаў заняткаў па няўважлівых прычынах прыпадае на студэнтаў IV курсаў.

Пры разглядзе вынікаў зімовай экзаменацыйнай сесіі неабходна сказаць і аб тым, што ўзровень вучэбна-метадычнай, арганізатарскай работы асобных кафедр яшчэ недастаткова высокі і не адпавядае сучасным патрабаванням.

На шэрагу факультэтаў і кафедр парушаецца графік вучэбнага працэсу, далёкія ад дасканаласці рабочыя праграмы, недастаткова арганізуецца абмен вопытам метадычнай работы паміж асобнымі кафедрамі.

Сур'ёзныя недагляды маюцца і ў арганізацыі ўнутрывузаўскага кантролю. Планам работы на 1977-78 навучальны год прадугледжвалася стварэнне арганізацыйна - метадычных груп на факультэтах і звенняў на кафедрах. Але да гэтай пары на некаторых факультэтах і кафедрах такія групы і звенні кантролю не арганізаваны. Не на ўсіх факультэтах і кафедрах складзены графікі кантролю вучэбнай дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу, вынікі кантролю не разглядаюцца на пасяджэннях кафедр, саветах факультэтаў.

Ва універсітэце шмат зроблена па выкарыстанню ў вучэбным працэсе тэхнічных сродкаў навучання, метадаў праграміраванага навучання і электронна-вылічальнай тэхнікі. Але нам неабходна зрабіць яшчэ больш.

Адной з важнейшых задач з'яўляецца задача забеспячэння на працягу 1978 года лекцыйных курсаў дыдактычнымі матэрыяламі, кінадыядапаможнікамі і іншымі сродкамі нагляднасці. Магчымасці зараз у нас ёсць. Фоталабараторыя універсітэта наладзіла вытворчасць дыяпазітываў у каляровым і чорна-белым адлюстраванні. Заслугоўваюць пахвалы кафедры: сістэматыкі раслін, гісторыі КПСС, археалогіі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, педагогікі, псіхалогіі, агульнай фізікі, якія практычна цалкам забяспечылі лекцыйныя курсы дыядапаможнікамі.

Зняважлівыя адносіны да выкарыстання дыядапаможнікаў назіраюцца ў некаторых выкладчыкаў хімічнага, радыёфізічнага, матэматычных факультэтаў, кафедр палітэканоміі, філасофскіх кафедр.

Другой важнай задачай з'яўляецца стварэнне фоназапісаў лекцый. Пакуль гэта робіць толькі кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.

Павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў звязана з рашэннем задач камуністычнага выхавання студэнтаў. У гэтым плане ў нас робіцца шмат. Распрацаваны план і праграма ідэйна-выхаваўчай работы на ўвесь перыяд навучання, план прававога выхавання і іншыя дакументы.

Аднак выхаванне студэнтаў яшчэ не стала клопатам многіх кафедр, кожнага выкладчыка і супрацоўніка універсітэта. Усё яшчэ працягвае мець месца імкненне некаторых кафедр і асобных выкладчыкаў абмежаваць сваю дзейнасць толькі пытаннямі перадачы навуковай інфармацыі студэнтам і навуковай работай.

Цяпер спынімся на тых задачах, якія нам неабходна вырашыць у другім семестры. Дэканатам і кафедрам неабходна ўзмацніць увагу да вывучэння, абагульнення і ўкаранення ў практыку вопыту лепшых выкладчыкаў, рашэння праблем дасканалення навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу, прымянення новых форм і тэхнічных сродкаў навучання, арганізацыі самастойнай работы студэнтаў і творчага засваення імі ўсіх дысцыплін вучэбнага плана. Трэба навучыць студэнтаў уменню самастойна папаўняць свае веды. Таму самастойную работу студэнтаў трэба планаваць так, як мы плануем і абавязковыя вучэбныя заняткі.

Неабходна шырэй выкарыстоўваць юбілейныя матэрыялы і палажэнні новай Канстытуцыі, пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне і перавыкананне народнагаспадарчых планаў на 1978 год у ідэйна-палітычным, працоўным і маральна-прававым выхаванні студэнтаў. Пастаянна павышаць персанальную адказнасць кожнага выкладчыка за правядзенне заняткаў. Пытанні якасці выкладання, ідэйна-палітычнай і выхаваўчай накіраванасці лекцый, практычных і іншых відаў заняткаў павінны рэгулярна заслухоўвацца на саветах і пасяджэннях кафедр.

Трэба дабіцца таго, каб вучэбны працэс ва універсітэце быў цікавым, захапляючым, з'яўляўся асновай ідэйнага выхавання студэнтаў.

Прынятая нядаўна пастанова ЦК КПСС «Аб стане і мерах паляпшэння лекцыйнай прапаганды» мае прамое дачыненне і да работнікаў ВНУ. У пастанове, у прыватнасці, сказана, што лекцыйная прапаганда (а значыць, і нашы лекцыі і іншыя віды заняткаў) павінна быць глыбока навуковай па зместу і яркай па форме, непрымірымай і наступальнай у барацьбе з буржуазнай, мааісцкай і рэвізіяніскай ідэалогіяй, даваць вычарпальныя адказы на важныя і вострыя пытанні, служыць эфектыўным сродкам фарміравання і вывучэння грамадскай думкі.

У другім семестры асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на студэнтаў-выпускнікоў, стварыць ім добрыя ўмовы для выканання дыпломных работ і падрыхтоўкі да здачы дзяржэкзаменаў. У самы бліжэйшы час заслухаць на саветах факультэтаў пытанне аб стане напісання студэнтамі дыпломных работ.

Важныя задачы стаяць перад намі і ў справе фізічнага выхавання студэнцкай моладзі.

Вялікі аб'ём работы належыць нам выканаць па арганізацыі і правядзенню новага набору студэнтаў на асноўныя факультэты і падрыхтоўчае аддзяленне. Рэктарат універсітэта распрацаваў комплекс мерапрыемстваў, звязаных з арганізацыяй і правядзеннем новага набору студэнтаў. Задача дэканатаў, кафедр, прыёмнай камісіі, усіх нас заключаецца ў тым, каб здзейсніць усе гэтыя мерапрыемствы.

**У. ІВАШЫН,**
**прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце.**



Другі вучэбны семестр у разгары. Пройдзе не так ужо многа часу, і — зноў сесія, зноў хваляванні, адказы на экзаменах, радасці атрыманых перамог. А пакуль што—заняткі, заняткі, заняткі...



На здымках: лекцыю другакурснікам геафака чытае дацэнт В. А. Навіцкі.

Фота В. ДРАЧОВА.

# МАСКВА СУСТРЭЛА ПЕРАМОЖЦАЎ

Нядаўна ў Маскве праходзіла сустрэча пераможцаў Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» 1976-77 навучальнага года. Наш універсітэт у Маскве прадстаўлялі 7 студэнтаў-пераможцаў Усесаюзнай алімпіяды: Андрэй Рапінчук, Анатоль Разанаў, Аляксандр Вечар, Алена Прасвірніна, Алег Мірашнічэнка, Ірына Аляб'ева, Галіна Крупкіна.

Масква гасцінна сустрэла 360 пасланцоў усіх рэспублік. Студэнты сустрэліся з вядучымі вучонымі СССР, наведалі навукова-даследчыя інстытуты, пабывалі ў Політэхнічным музеі, на ВДНГ СССР. Дэлегацыі ад усіх саюзных рэспублік усклалі вянкі да магілы Невядомага салдата, пабывалі на дарагой кожнаму савецкаму чалавеку Чырвонай плошчы.

На заключным урачыстым сходзе студэнтам былі ўручаны дыпломы і медалі пераможцаў Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Спецыяльны прыз быў уручан самаму маладому ўдзельніку сустрэчы — студэнту БДУ Андрэю Рапінчуку. Урачысты сход завяршыўся вялікім святочным канцэртам.

Савет выдатнікаў БДУ і СНТ універсітэта заклікаюць усіх студэнтаў прыняць актыўны ўдзел у алімпіядах і конкурсах гэтага навучальнага года і жадаюць творчых поспехаў на нялёгкім даследніцкім полі дзейнасці.

**А. ПРАСВІРНІНА,**
**старшыня савета выдатнікаў пры камітэце камсамола БДУ.**

# Заўсёды на пасту

Як адзначаў таварыш Л. І. Брэжнеў, ахова і падтрымка грамадскага парадку і законнасці, адпачынку і працы савецкіх грамадзян — справа не толькі работнікаў міліцыі, суда і пракуратуры. Гэта кроўная справа ўсіх грамадскіх, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

...Калі вячэрні змрок апускаецца на алеі бульвараў і сквераў, на плошчы і дахі дамоў горада, калі ў розных яго канцах запальваюцца яркія агеньчыкі, яны рыхтуюцца да выхаду на дзяжурства. Атрымліваюць апошнія інструкцыі, надзяваюць павязкі з надпісам «Дружыннік» і спяшаюцца на свой пост. Спяшаюцца да нас, да людзей, каб у патрэбны момант прыйсці на дапамогу, паспець адвесці бяду. Мы нават не ведаем у твар гэтых хлопцаў і дзяўчат, не ўгадваем іх у шматаблічным людскім патоку, але заўсёды адчуваем — яны побач...

У вялізную армію дружыннікаў г. Мінска ўліваюцца і члены ДНД БДУ імя У. І. Леніна, якія ў гэты дзень сабраліся на свой злёт, каб разам вырашыць праблемы, выявіць недахопы, абмяняцца вопытам, падвесці вынікі зробленага, вызначыць свой, як кажуць, каэфіцыент карыснага дзеяння...

У ДНД універсітэта зараз 11 дружын, якія аб'ядноўваюць 1.011 дружыннікаў. Раён іх дзеяння — Маскоўскі. Кожны рэйд для рабят — гэта праверка знаходлівасці, выкананне абавязку, самаадданасць. Толькі за апошняе дзяжурства студэнтамі біяфака было затрымана 9 правапарушальнікаў.

Нашы асноўныя задачы, адзначыў у дакладзе камандзір ДНД універсітэта А. І. Сідарэнка,—перш за ўсё ахова грамадскага парадку і правоў грамадзян, актыўны ўдзел у папярэджанні і ліквідацыі правапарушэнняў.

Канешне, стварэнне ДНД — адно з канкрэтных праяўленняў удзелу моладзі ў справе аховы парадку ў краіне. Роля яе асабліва ўзрасла ў нашы дні.

Аб рабоце дружыны універсітэта добра адазваўся старшы ўчастковы інспектар райаддзела міліцыі маёр Н. Т. Каляда. Ён адзначыў, што з паяўленнем у раёне добраахвотных памочнікаў колькасць штодзённых заяў у міліцыю скарацілася да 5—8 (раней было да 20—30).

Камітэт камсамола універсітэта аказвае вялікую дапамогу ў арганізацыі работы ДНД, мабілізуе рабят, падтрымлівае цесную сувязь са штабам. А штаб, у сваю чаргу, праводзіць нарады з камандзірамі, на якіх яны абменьваюцца вопытам, атрымліваюць інструктаж, выпрацоўваюць адзіны план дзеяння дружын універсітэта.

Ёсць, безумоўна, і некаторыя недахопы ў рабоце ДНД. Напрыклад, яшчэ не вельмі добра арганізавана работа дружыннікаў на гістфаку, мехмаце. Толькі нядаўна, нарэшце, было вырашана пытанне аб дружыне філфака, дзе ў асноўным вучацца дзяўчаты. Цяпер іх дружына аб'ядноўваецца з дружынай фізфака.

Сваёй бліжэйшай задачай злёт паставіў умацаванне радоў ДНД БДУ імя У. І. Леніна. Было вырашана праводзіць падбор дружыннікаў персанальна і звяртаць асаблівую ўвагу на ідэйна-палітычныя якасці кандыдатаў у ДНД. Акрамя таго, дружыны факультэтаў павінны імкнуцца захаваць у сваіх радах старых байцоў-студэнтаў IV і V курсаў.

На злёце выступілі камандзіры атрадаў А. Ракевіч, В. Дзятчык і іншыя члены добраахвотнай народнай дружыны. На закрыцці злёту А. І. Сідарэнка вынес падзяку найбольш актыўным дружыннікам А. Гарбачову, В. Дзятчыку, В. Ждановічу, А. Аляксеенку, В. Булатаву, А. Гарошка і многім іншым. Граматай камітэта камсамола ўзнагароджан камандзір ДНД факультэта журналістыкі Г. А. Жураўлёў і студэнт А. Марчук.

Ад імя ўсіх удзельнікаў злёту А. І. Сідарэнка сказаў, што члены ДНД універсітэта будуць імкнуцца яшчэ больш актывізаваць работу кожнай дружыны факультэта, кожнага дружынніка.

**В. ПЕТУХОЎСКАЯ,**
**студэнтка вячэрняга аддзялення журфака.**

**Сёння мы пачынаем публікацыю нарыса студэнта II курса факультэта журналістыкі УЛАДЗІМІРА БЕЛЬСКАГА «Географы». Нарыс прысвечан станаўленню калектыву студэнцкай групы № 1 V курса геаграфічнага факультэта — адной з лепшых акадэмічных груп універсітэта.**

**У. БЕЛЬСКІ**

# ГЕОГРАФЫ

**НАРЫС**

### ЗНАЁМСТВА

ДЗЕСЯТКІ пар вачэй сачылі за кожным яе рухам, пільна і насцярожана. Куратар... Слова ж нейкае незразумелае. Яна ў іх будзе гэтым самым куратарам. Ціхі шэпт перакідваўся з аднаго кутка аўдыторыі ў другі, заміраў.

— Ну што, можа, даволі агляду і шэптаў? Дазайце гаварыць услых. Мяне завуць Людміла Андрэеўна, прозвішча — Паўловіч, выкладчык кафедры эканамічнай геаграфіі. А вас як? Толькі па парадку. Ну, хто смялейшы?

Аўдыторыя зноў зашапталася і нейкую хвіліну знаходзілася ў нерашучасці.

— Вось вас я ўжо ведаю. З Сашам мы старыя знаёмыя. Праўда, Шкарупа? А вас як завуць?

— Саша... Сінягуб.

— Міша... Струк.

На адной з парт увагу прыцягнуў юнак — каржакаваты, прысадзісты. «Відаць, спартсмен»,—падумала Людміла Андрэеўна, а ўслых спытала:

— А вы хто будзеце?

— Я? Валік, а што?

— ...Глянь мускулы якія! Во гэта біцэпсы!

— Кінь, Саша, займайся спортам, дык і ў цябе такія будуць.

— І будуць, пабачыш! Яшчэ якія будуць!

**Зашумелі ўсе разам: хто пра мускулы, хто пра гіры, якія цягаюць спартсмены, пра шампунь, які прывезлі ў ГУМ... Людміла Андрэеўна села сярод першакурснікаў, не перабівала, маўчала, а потым і сама падключылася ў агульную размову.**

**Першы курс... Ён заўсёды цікавы і незабыўны. Цікавы, можа, тым, што першы, а першае надоўга застаецца ў памяці, ляжыць у ёй асобнай праслойкай. Цікавы непасрэднасцю першакурснікаў, сарамлівых, нерашучых, дапытлівых. Ён застаецца эталонам параўнання на ўсе гады вучобы.**

Людміла Андрэеўна ўстала з-за стала, прайшла да кафедры, усміхнулася. Прыкладна так адбылася яе першая сустрэча пяць год назад з яе першым курсам. А зараз вось другая сустрэча з першакурснікамі. Відаць, спачатку ўсе такія: непасрэдныя, цікавыя і таямнічыя.

Што яна можа сказаць зараз пра іх? Нічога. Зусім нічога. Ды і рана гаварыць, нават думаць. А час раскажа.

### ГРЭЦКІ АРЭХ

КАЛЕКТЫЎ... Гэта група людзей, якія аб'яднаны працай, агульнымі інтарэсамі. Яны разумеюць адзін аднаго з паўслова, гатовы ісці на дапамогу таварышу. Разам са службовым доўгам тут ёсць доўг грамадзянскі, таварыскі. У слова «калектыў» вялікі сэнс. Гэта вышэйшая ступень садружнасці. Але як дасягнуць яе?..

Праблема згуртавання хвалявала і першы курс. Пакуль ён калоўся, як грэцкі арэх — раптоўна і на кавалкі. Рваўся, як марля, пакідаючы па адзін і па другі бакі ніткі нерашучасці і няўпэўненасці.

Пачалося з «бульбы».

Студэнцкая «бульба»! Хто яе не ведае?! Гэта праверка ўсяго чалавека. Тут нельга замаскіравацца і хадзіць у ценю іншых, таму што ценяў няма. Ёсць нехта з імем, прозвішчам, за якім яго характар, паводзіны, захапленні...

**Яны пазналі адзін аднаго. Можа, і не зусім, але частковае ўяўленне ёсць. У кожнага сваё, асабістае. Можа, ад гэтага змяніліся іх адносіны, калі за імем і прозвішчам пачалі бачыць самога чалавека?.. Відавочна, было толькі тое, што адзінай групы не склалася. Яна разбілася на групкі, маленькія і розныя. Паміж імі — халоднасць. Яна з кожным днём расла, накаплівалася, але выйсці наверх яшчэ не магла. Амаль ніхто не змог знайсці сабе таварыша па інтарэсах; так атрымалася, што два ці тры чалавекі былі разам, але ці сябравалі яны?**

**Неяк зверху на ўсіх глядзеў Валік Марчук. Курс на яго аўтарытэт рэзка падскочыў, калі першакурснікі даведаліся, што ён майстар спорту па цяжкай атлетыцы. Марчук сапраўды быў на п'едэстале групы. Ніхто толькі не разумеў, ды і не ўнікаў у дробязі, хто сапраўды быў на тым п'едэстале: майстар спорту ці сам Валік.**

Для Сінягуба гэта было не дробяззю. Тое, што ён хадзіў з Марчуком у сталоўку, кіно, неяк падняло і яго ў вачах іншых. Але што агульнага было ў іх, не ведалі, бадай, ні Валік, ні Саша. Для Сашы Марчук стаў ідэалам сапраўднага мужчыны: важная паходка, раўнавага і, галоўнае,— звычка глядзець на іншых, як на нуль. Аднойчы ў сталоўцы ўчынілі турнір: «Хочаш, я пранясу вунь тую цялежку з посудам?» Валік глянуў на Сашу. «Я і сам змагу»,— Саша нетаропка падышоў да цялежкі... Потым балелі спіна і рукі, у вачах некалькі хвілін стаялі кругі. Але што гэта ў параўнанні з Валікавым: «Малайчына!» Да таго ж, як на яго глядзелі астатнія!

Астатнім сапраўды заслужыць такую пахвалу было цяжэй. Чым мог пахваліцца сціплы, з рысамі нейкай дзявочай сарамлівасці Грыша Тыбербай або самы старэйшы ў групе Струк Міша? Валікава спартыўная фігура «засланіла» тое, што Міша, напрыклад, пайшоў працаваць тады, калі некаторыя з яго аднакурснікаў, відаць, толькі пайшлі ў школу.

**Ала Фалько і Галя Турава адразу сталі трымацца разам, хоць і не разумелі спачатку, што іх цягнула адна да другой. Можа, выйсце было прадыктавана бояззю застацца ў адзіноце? Не, гэта было нешта большае. Гэта было сяброўства, якому потым будуць у групе зайздросціць, з якога будуць браць прыклад.**

**Коля Шупляков ні з каго прыкладу не браў. Лічыў сябе індывідуумам, дастойным астатніх, у некаторых выпадках нават лепшым. Гэта на яго погляд. Ён мог ужо казырнуць перад астатнімі сваёй дасведчанасцю ў справах факультэта. Ведаў, як звалі выкладчыкаў, нават мог расказаць іх біяграфіі. Трымаўся адзін. Каб зусім адзін, нельга сказаць. Ён быў заўсёды сам з сабою. Не лічыў абавязкам параіцца, не «апускаўся» да таго, каб уступіць у спрэчку з Сашам Недасеенкам, якога ўсе пачалі паважаць за яго дасведчанасць, эрудыцыю, нейкі філасофскі склад розуму (дыскуціраваць з ім мог, бадай, толькі Шкарупа).**

Недасеенка і Шкарупа гадзінамі маглі горача і сур'ёзна нешта даказваць адзін аднаму, потым запісаць на паперу, каб не забыцца, кожны свае думкі і паставіць подпісы. Кожны свой. А назаўтра перачытаць запісы і прыйсці да аднаго вываду. Хоць здаралася гэта і не часта.

Аднойчы Недасеенка зрабіў свой вывад аб групе. Абгрунтаваўшы ўсе «пасылкі», ён вывеў індукцыйнае разумовае заключэнне: ад прыватнага да агульнага, ад простага да складанага. У групе Саша бачыў пакуль што толькі прыватнае. Усё стала адразу такім складаным, што ўжо больш складаным ён не мог уявіць. Што датычыцца простага, дык яго ніхто не заўважыў. На самае простае, часцей, не звяртаюць увагі. А можа яго і не было? Недасеенка спрабаваў зрабіць дэдукцыйнае разумовае заключэнне: ад агульнага да прыватнага. Але ні першае, ні другое не давалі пэўнага адказу на пытанні, што робіцца з групай і чаму.

**(Працяг у наступным нумары).**

# Васіль Іванавіч Сцяпанаў

(ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



**Імя прафесара Васіля Іванавіча Сцяпанава шырока вядома не толькі ў нашай рэспубліцы, але і за яе межамі. Ён выдатны вучоны, адзін з буйных спецыялістаў у галіне рускай філасофіі і тэорыі пазнання дыялектычнага матэрыялізму.**

**В. І. Сцяпанаў нарадзіўся 13 сакавіка 1903 года ў в. Залатое Саратаўскай вобласці. За яго плячыма вялікі і яркі жыццёвы шлях. Выхадзец з сялянскай сям'і, Васіль Іванавіч Сцяпанаў за гады Савецкай улады атрымаў сярэднюю і вышэйшую адукацыю, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, увайшоў у лік вядучых вучоных у галіне марксісцка-ленінскай філасофіі. У 1967 годзе ён быў выбран членам-карэспандэнтам АН БССР. Агульны аб'ём апублікаваных ім навуковых работ складае звыш 90 аўтарскіх аркушаў, асабліва месца сярод іх займае манаграфія «Філасофскія і сацыялагічныя погляды В. Р. Бялінскага».**

**З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны В. І. Сцяпанаў быў у радах абаронцаў Радзімы. У 1942 годзе ён быў накіраван у першую гвардзейскую танкавую армію ў якасці лектара аддзялення прапаганды і агітацыі палітаддзела. Вёў агітацыйна-прапагандысцкую работу ў войсках у час вызвалення Польшчы, удзельнічаў у разгроме фашысцкіх войск у Германіі, у тым ліку ў Берлінскай аперацыі. Узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі і многімі баявымі медалямі.**

**У 1947 годзе ЦК КПБ накіроўвае В. І. Сцяпанава ў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна для арганізацыі вучэбна-педагагічнага працэсу і падрыхтоўкі маладых навуковых кадраў для рэспублікі. В. І. Сцяпанаў узначаліў кафедру марксісцка-ленінскай філасофіі, якой кіруе і зараз. Як умелага арганізатара партыйныя органы рэспублікі ў 1962 годзе назначаюць В. І. Сцяпанава прарэктарам па навуковай рабоце. На гэтым пасту ён знаходзіўся да 1967 года і за гэты час аддаў нямала сіл для далейшага развіцця навукі ва універсітэце.**

**За гады работы вучоны падрыхтаваў больш як 30 кандыдатаў навук. У ліку яго выхаванцаў 4 дактары навук.**

**Васіль Іванавіч шмат часу аддае арганізацыі педагагічнай і навуковай работы на кафедры, рэдагаванню артыкулаў, зборнікаў, манаграфій, рабоце ў рэдакцыях журналаў і іншых выданняў. Больш дваццаці гадоў ён з'яўляецца членам рэдкалегіі часопіса «Коммунист Белоруссии», быў членам рэдакцыйнага савета і навуковым кансультантам дванаццацітомнай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Пад яго навуковым рэдагаваннем выйшлі ў свет кнігі многіх вучоных. В. І. Сцяпанаў з'яўляецца галоўным рэдактарам і аўтарам зборніка артыкулаў «Пытанні дыялектычнага матэрыялізму», ён прыняў удзел у выданні калектыўнай манаграфіі «Ленінская гнасеалагічная спадчына і яе значэнне для навукі», якая падрыхтавана сумесна з філосафамі Іенскага універсітэта.**

**Васіль Іванавіч Сцяпанаў з'яўляецца членам таварыства «Веды», на працягу 30 год кіруе філасофскім семінарам прафесарска-выкладчыцкага саставу прыродазнаўчых факультэтаў. За шматгадовую лектарскую прапагандысцкую дзейнасць ён удастоен самай высокай узнагароды Усесаюзнага таварыства «Веды» — Памятнага медаля імя С. І. Вавілава, а кіруемы ім калектыў кафедры — Пахвальнай граматы прэзідыума таварыства «Веды» БССР.**

**Заслужаны дзеяч навукі, член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі В. І. Сцяпанаў увасабляе лепшыя якасці савецкага вучонага, выхаванага Камуністычнай партыяй, членам якой ён з'яўляецца з лістапада 1924 года.**

**Ю. ГУСЕЎ,**
**А. ЛЯУКО,**
**І. ШАЦІЛА.**

**У АБ'ЕКТЫВЕ — ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ**



**Студэнты 4 курса Генадзь Сахарчук і Уладзімір Марозаў працуюць з вымяральнікам параметраў транзістараў.**

**Фота В. ДРАЧОВА.**

# ДРУЖБЕ МАЦНЕЦЬ

**(Да 30-годдзя з дня падпісання Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе СССР і НРБ).**

Нямала знамянальных дат звязваюць савецкі і балгарскі народы. І зараз набліжаецца адна з іх — 18 сакавіка. У гэты дзень, у 1948 годзе, паміж Савецкім Саюзам і Балгарыяй быў падпісан Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе. Лагічным прадаўжэннем яго з'явіўся новы Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, заключаны 12 мая 1967 года. Замацаваўшы вопыт, назапашаны за мінулы перыяд, ён стаў важнейшым фактарам мацнеючага з дня ў дзень палітычнага, эканамічнага, ідэалагічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж СССР і НРБ.

Значны ўклад у развіццё савецка-балгарскіх адносін разам з іншымі саюзнымі рэспублікамі ўносіць і Беларусь. Брацкая дружба паміж БССР і НРБ — неад'емная частка паглыбляючагася працэсу збліжэння Савецкага Саюза і сацыялістычнай Балгарыі.

Адным з прыкладаў гэтых сяброўскіх сувязей з'яўляецца растучае навуковае і культурнае супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна і Сафійскім універсітэтам імя Клімента Ахрыдскага.

Падпісаны ў снежні 1966 года Дагавор, наступныя рабочыя праграмы, якія аднаўляюцца кожныя два гады, прадугледжваюць аказанне ўзаемнай дапамогі ва ўдасканаленні навучальнага працэсу, супрацоўніцтва ў справе павышэння ўзроўню навуковай і выхаваўчай работы, узаемны абмен навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, устанаўленне цесных сувязей паміж грамадскімі арганізацыямі.

Усё большае месца ў нашым супрацоўніцтве займаюць сумесныя даследаванні па важных праблемах фізікі, матэматыкі, біялогіі, напісанне агульных прац па гісторыі, філалогіі, геаграфіі.

За мінулыя гады 87 вучоных нашага універсітэта выязджалі ў Балгарыю для чытання лекцый і навуковай работы. У сваю чаргу нашы калегі з Сафійскага універсітэта часта бываюць у Мінску. Вынікам гэтых навуковых камандзіровак з'явілася выданне трох манаграфій, абарона доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, распрацоўка новых спецкурсаў.

З 1967 года на вытворчую азнаямленчую практыку ў Сафійскі універсітэт выязджалі 233 студэнты з БДУ.

Паспяхова вядзецца кнігаабмен паміж бібліятэкамі універсітэтаў-пабрацімаў.

У развіццё сяброўскіх сувязей паміж Беларускім і Сафійскім універсітэтамі значны ўклад уносіць аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы, створанае ў студзені 1969 года.

Адзначаючы знамянальны юбілей, народы Савецкага Саюза і Балгарыі ў адзіным страі з брацкімі народамі сацыялістычнай садружнасці паспяхова ствараюць сацыялістычнае і камуністычнае грамадства, адстойваюць мір на зямлі.

# РЫХТУЙЦЕСЯ ДА АГЛЯДУ!

**ПАЛАЖЭННЕ АБ ПРАВЯДЗЕННІ ФЕСТЫВАЛЮ САМАДЗЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

Мэта агляду — далейшае развіццё самадзейнай мастацкай творчасці на факультэтах, прапаганда сродкамі мастацтва сусветна-гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, гераічнай гісторыі Камуністычнай партыі і Савецкай краіны, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый народа, самаадданай працы савецкага народа, рабочага класа, калгаснікаў і народнай інтэлігенцыі — будаўнікоў камуністычнага грамадства; павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню самадзейнасці, узбагачэнне рэпертуару факультэцкай мастацкай самадзейнасці высокамастацкімі творамі; дасягненне ўдзельнікамі самадзейнасці высокай якасці выканання.

Арганізатарамі агляду з'яўляюцца: рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком і кіраўніцтва клуба універсітэта.

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіць арганізацыйны камітэт у саставе:

**Малышаў А. Я. — старшыня, прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ**

**Тозік А. А.—намеснік старшыні, сакратар камітэта камсамола**

**Навумовіч У. А. — намеснік сакратара парткома**

**Лысенка С. А.—член парткома**

**Дрозд М. М.—старшыня прафкома**

**Тыцюк Д. Г. — старшыня праўлення клуба**

**Кузняцова Н. А. — мастацкі кіраўнік клуба.**

**Састаў журы:**

старшыня—Бравaрская З. І.—нар. арт. БССР

нам. старшыні—Озераў А. М.—засл. арт. Латвійскай ССР

нам. старшыні—Тыцюк Д. Г.—старшыня праўлення клуба.

Члены: Лісіцын М. А.—засл. работнік культуры БССР

Лапша М. В.—засл. работнік культуры БССР

Гуляеў В. І. — выкладчык Белдзяржкансерваторыі

Пастуніна Т. М.—засл. арт. БССР, выкладчык Белдзяржкансерваторыі

Кузняцова Н. А.—мастацкі кіраўнік клуба

Ткачэнка І. Р.—загадчык культмасавага сектара абкома прафсаюза работнікаў ВШ і НУ

Паграбінская С. Я. — хормайстар народнай харавой капэлы

Локіс У. П.—нам. старшыні прафкома

Прыгодзіч М. Р. — член камітэта камсамола.

Па аднаму прадстаўніку ад факультэтаў.

Журы агляду вызначае тры першыя месцы па суме балаў. Нумары мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца па дзесяцібальнай сістэме. Галоўным паказчыкам для падвядзення вынікаў агляду будзе сума балаў, якую факультэт атрымае за лепшыя 15 нумароў праграмы. Час конкурснай праграмы—1,5 гадзіны.

Даючы ацэнку мастацкаму ўзроўню выканання, журы звяртае ўвагу на сцэнічную культуру і дысцыпліну ўдзельнікаў агляду. Журы мае права заахвочваць факультэты (ад 5 да 10 балаў) за лепшае сцэнічнае вырашэнне канцэртнай праграмы.

Рашэнне журы аб'яўляецца на заключным канцэрце ў красавіку 1978 г.

**Месца і час.**

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіцца ў актавай зале універсітэта з 20 па 25 сакавіка 1978 года.

**Удзел у аглядзе і яго ўмовы.**

У аглядзе могуць удзельнічаць студэнты дзённай і вячэрняй форм навучання.

Факультэту прадастаўляецца права правесці рэпетыцыю ў актавай зале непасрэдна ў дзень агляду працягласцю не больш 2 гадзін.

У час агляду факультэты паказваюць паўтарагадзінную праграму. Кожны факультэт павінен як мага шырэй прадставіць у сваёй канцэртнай праграме розныя жанры і формы самадзейнага мастацтва: вакальныя ансамблі, танцавальныя групы, майстэрства дэкламацыі, народныя, эстрадныя аркестры і ансамблі, інструментальныя эцюды, пантаміму і г. д. Выступленні тэатра мініяцюр і агітбрыгады ацэньваюцца як адзін нумар. Кожны асобны выступаючы мае права выканаць не больш двух твораў аднаго жанру. Для кожнага жанру ўстанаўліваюцца тры першыя месцы, за якія факультэт атрымлівае дадатковыя балы.

**Харавыя калектывы:**

I месца—30 балаў
II месца—25 балаў
III месца—20 балаў

**Ансамблі** (усіх жанраў: вакальныя, танцавальныя, інструментальныя, вакальна-інструментальныя):

I месца—15 балаў
II месца—10 балаў
III месца—5 балаў

**Асобныя выканаўцы:**

I месца—10 балаў
II месца—8 балаў
III месца—5 балаў

Праграму канцэрта неабходна прадставіць у праўленне клуба ў 15 экземплярах з указаннем імёнаў і прозвішчаў аўтараў твораў і выканаўцаў нумароў.

**Прызы:**

Рэктарат Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ўвёў наступныя прызы і ўзнагароды пераможцам агляду мастацкай самадзейнасці:

за I месца—пераходны прыз, пахвальная грамата і грашовая прэмія ў памеры 150 рублёў

за II месца—пахвальная грамата і грашовая прэмія ў памеры 100 рублёў

за III месца—пахвальная грамата і грашовая прэмія ў памеры 80 рублёў.

**Уведзены спецыяльныя прызы:**

за масавасць

за лепшае выкананне патрыятычнай маладзёжнай песні (прыз камітэта камсамола)

лепшаму дэкламатару

лепшаму танцору

лепшаму салісту-вакалісту

лепшаму інструменталісту.

У выніку жэраб'ёўкі вызначыўся наступны парадак выступленняў факультэтаў на аглядзе мастацкай самадзейнасці БДУ імя У. І. Леніна:

**20 сакавіка** 18.00 механіка-матэматычны факультэт,

19.30 юрыдычны факультэт.

**21 сакавіка** 18.00 факультэт журналістыкі,

19.30 факультэт прыкладной матэматыкі.

**22 сакавіка** 18.00 фізічны факультэт,

19.30 геаграфічны факультэт.

**23 сакавіка** 18.00 хімічны факультэт,

19.30 факультэт радыёфізікі і электронікі.

**24 сакавіка** 18.00 гістарычны факультэт,

19.30 біялагічны факультэт.

**25 сакавіка** 15.00 філалагічны факультэт.

**АРГКАМІТЭТ.**

# Віншуем СТ!

**ПРЫСВАЕННЕ СТУДЭНЦКАМУ ТЭАТРУ БДУ ЗВАННЯ «НАРОДНЫ» — ГЭТА ПРЫЗНАННЕ ЯГО ВЫСОКІХ ТВОРЧЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ, АЎТАРЫТЭТУ КІРАЎНІЦТВА, МАЙСТЭРСТВА ВЫКАНАЎЦАЎ РОЛЕЙ.**

Студэнты любяць свой тэатр, з нецярплівасцю чакаюць кожную яго прэм'еру. Яны добра памятаюць непасрэднасць Джульеты (Н. Дземідзенка) і палкасць Рамэо (А. Цыгулёў), мудрасць чапэкаўскай маці (Н. Пікарская) і мужнасць Паўла Марозава (А. Касцецкі)... Якой усхваляванай была зала пасля апошняга спектакля СТ — пастаноўкі п'есы М. Рошчына «Валянцін і Валянціна»! Колькі думак і спрэчак нарадзілася ў дні гэтай прэм'еры!

Калі глядзіш спектаклі тэатра, міжволі думаеш, што яму падуладны ўсе жанры — ад трагедый Шэкспіра да камедыі сучаснасці. Зараз тэатр працуе над п'есамі актуальнымі, злабадзённымі, адрасаванымі моладзі. Гэта «Шасцёра закаханых» А. Арбузава і «Каханне, джаз і чорт» Ю. Грушаса. Пастаноўкаі кіруе А. М. Озераў, заслужаны артыст Латвійскай ССР, нязменны рэжысёр тэатра.

13 год аддаў Аляксандр Міхайлавіч студэнцкаму тэатру БДУ. Ён увасобіў у ім свае прынцыпы рэжысуры, шчодра перадаў вучням — самадзейным артыстам — навыкі акцёрскага майстэрства. Дастаткова сказаць, што выхаванец СТ Анатоль Касцецкі іграе зараз на сцэне тэатра музычнай камедыі БССР.

Але студэнцкі тэатр ніколі не ставіў сваёй задачай падрыхтоўку артыстаў для прафесійнай сцэны. Ён бачыў сваё высокае прызначэнне ў абуджэнні душ, загартоўцы характараў выканаўцаў і гледачоў са шматлікай арміі студэнцтва.

Кожную вясну мы чакалі і чакаем прэм'еру, каб адчуць усю паўнату шчасця — шчасця, калі на нашых вачах адбываецца цуд сапраўднага мастацтва. Дзякуй табе, тэатр, за юнацкі максімалізм і непадкупную шчырасць. Мы віншуем твой калектыў з дастойным званнем і спадзяёмся на новыя і заўсёды хвалюючыя сустрэчы.

**У АБ'ЕКТЫВЕ—ВАЕННАЯ КАФЕДРА**



**НА ЗДЫМКАХ:**
**падпалкоўнік А. М. Іваноў праводзіць заняткі па страявой падрыхтоўцы з другакурснікамі фізфака (верхні здымак);**
**старшы выкладчык кафедры падпалкоўнік Р. І. Пека на занятках па тактычнай падрыхтоўцы ў трэцякурснікаў гістарычнага факультэта.**



Фота **В. ДРАЧОВА.**

# Мой сябар—фотааб'ектыў

У гэтым навучальным годзе на факультэце грамадскіх прафесій працуе новае аддзяленне па падрыхтоўцы фотакарэспандэнтаў. Дваццаць студэнтаў з розных факультэтаў вывучаюць тут фотасправу пад кіраўніцтвам Валерыя Міхайлавіча Брэка. Юнакі і дзяўчаты авалодваюць тэхнікай фатаграфавання, майстэрствам кампазіцыі, пастаноўкай святла і г. д. Асабліва цікава праходзяць заняткі па апрацоўцы дыяпазітываў і авалоданню тэхнікай фотамантажу. Студэнты вучацца рабіць фотарэпартажы для друку. Цэнтральным у плане вывучэння фотасправы з'яўляецца раздзел «Фатаграфія як мастацтва».

У наступным годзе на аддзяленні плануецца вывучэнне тэхнікі кіназдымкі.

**А. БАТРАСАВА,**
**студэнтка V курса філфака.**

# «Компас» у кніжным моры

Студэнты-першакурснікі дастаўляюць бібліятэкарам многа клопатаў. Як знайсці патрэбную літаратуру, дзе ўзяць патрэбную цытату для даклада — з гэтымі і многімі іншымі пытаннямі ў бібліятэку звяртаюцца амаль кожную хвіліну.

Дапытлівых і цікаўных запрашае выстаўка «Самастойная праца з кнігай», якую арганізавала бібліятэка. Выстаўка мае раздзелы: «Як знайсці патрэбную кнігу», «Кніга — крыніца ведаў», «Методыка работы з кнігай» і іншыя. «Компас» у у кніжным моры, думаецца, дапаможа і старшакурснікам пры рабоце над курсавымі і дыпломнымі працамі.

**А. МАРЧУК.**

# Сустрэчы ў сонечнай Балгарыі

У канцы лютага ў горадзе Плеўне адбылася нацыянальная студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю вызвалення Балгарыі ад асманскага іга. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел дэлегацыі з Венгрыі, ГДР, Румыніі, ФРГ, Фінляндыі і СССР, у якой знаходзіліся і студэнты V курса гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

Асабліва нам запомнілася сустрэча з членамі Плевенскага акруговага камітэта Дзімітраўскага камуністычнага саюза моладзі. Нам расказалі аб поспехах моладзі Плевенскай акругі ў будаўніцтве развітога сацыялізму ў НРБ, аб задачах, якія стаяць перад юнакамі і дзяўчатамі ў гады VII пяцігодкі.

У Сафійскім універсітэце адбылася гутарка з членамі камітэта камсамола гістарычнага факультэта. Мы пазнаёмілі сяброў з дзейнасцю нашага камітэта камсамола, студэнцкага навуковага таварыства.

**С. ЖУГІН,**
**студэнт V курса гістарычнага факультэта.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 418. Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 03122